УДК 947.6

# СКЛАД І ЗМЯНЯЛЬНАСЦЬ РАБОТНІКАЎ КІРУЮЧАГА АПАРАТА ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ, ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І АБ'ЯДНАННЯЎ БССР (1970–1980-я гг.)

**Пушкін Ігар Аляксандравіч**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання
(г. Магілёў, Беларусь)

Асабліва важным для сучаснага развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца правядзенне аналізу і ўсебаковага вывучэння шляхоў эканамічнага развіцця Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды. У прыватнасці, у 1970–1980-я гг., калі савецкая Беларусь стала займаць вядучыя пазіцыі ў эканоміцы СССР.

*1970–1980-я* гг. – *гэта час далейшага функцыянавання і развіцця ў Беларусі*, *як і ў цэлым* у СССР, *адміністрацыйна-каманднай эканамічнай сістэмы.* У першай палове 1970-х гадоў імпульс, дадзены рэформай 1965 г., паступова затухаў, у эканоміцы сталі нарастаць негатыўныя з'явы, якія ўсё больш узмацняліся ў наступныя гады. Беларуская эканоміка, як і ўся савецкая, усё больш адставала ад эканомікі вядучых капіталістычных краін па эфектыўнасці, тэхнічным і тэхналагічным узроўні, большасці іншых паказчыкаў. Каб спыніць хуткае зніжэнне тэмпаў эканамічнага росту, кіраўніцтва краіны абапіралася ў асноўным на пазаэканамічныя, адміністрацыйна-камандныя метады. З 1985 г., у сувязі з правядзеннем палітыкі "паскарэння і перабудовы" спрабавалі выправіць становішча ў эканоміцы шляхам вылучэння на кіруючыя пасады новых работнікаў, правесці працэс "амаладжэння" кадравага патэнцыяла краіны, але гэтага не адбылося таму, што сістэма рэалізацыі кадравай палітыкі заставалася ранейшай.

Аналіз склада і змяняльнасці старшынь аблвыканкамаў (6 чал.) і іх намеснікаў (30 чал.), старшынь і намеснікаў старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў (805 чал.), генеральных дырэктароў і дырэктароў прамысловых прадпрыемстваў і аб'яднанняў, кіраўнікоў будаўнічых трэстаў, начальнікаў домабудаўнічых і сельскіх будаўнічых камбінатаў БССР на 1.07.1985 г. засведчыў, што ў параўнанні з 1.07.1984 г. сярод гэтых катэгорый кадраў крыху павялічылася колькасць работнікаў, якія мелі інжынерна-тэхнічную, эканамічную або сельска-гаспадарчую адукацыю. Так, сярод старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў – 85,3%, у Брэсцкай, Гомельскай і Мінскай абласцей, адпаведна 95,7%, 90,9%, 86,8%. Адначасова сярод

намеснікаў старшынь аблвыканкамаў гэты паказчык знізіўся на 5,6%, намеснікаў старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў на 1,5%. Па стану на 13.07.1987 сярод намеснікаў старшынь аблвыканкамаў яе мелі – 86,7%, старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў – 89,4% (78,9% старшынь гарвыканкамаў), іх намеснікаў – 79,5%. 7 работнікаў савецках кіруючых кадраў былі кандыдатамі навук.

На 1.07.1985 г. колькасць савецкіх работнікаў кіруючага апарату, якія мелі партыйна-палітычную адукацыю, амаль не змянілася і складала 26,4%. Праз два гады 43,3% намеснікаў старшынь аблвыканкамаў, 47,8% старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў, 16% іх намеснікаў мелі падобную адукацыю. У параўнанні з 1986 г. сярод намеснікаў старшынь аблвыканкамаў, старшынь і намеснікаў старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў на 1,5% паменшылася колькасць тых, хто меў партыйна-палітычную адукацыю, а сярод старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў на 9%.

У 1980-я гг. памяншалася колькасць гарадскіх і раённых выканкамаў, дзе сярод старшынь і намеснікаў не было жанчын. У БССР у 1985 г. іх было на гэтых пасадах толькі 44 з 805 (у Брэсцкай вобласці – 10, у Віцебскай – 6, у Гомельскай – 7, Гродзенскай – 4, Мінскай – 5, Магілёўскай – 12). На 13.07.1987 г. толькі 9 выканкамаў (5%) узначальвалі жанчыны. У 49 выканкамах (больш 25%) сярод старшынь і намеснікаў наогул не было жанчын (у Брэсцкай вобласці ў 9, у Віцебскай – 6, Гомельскай – 11, Гродзенскай – 5, Мінскай – 5, Магілёўскай у 13 выканкамах). На 1.07.1990 г. сярод кіруючага складу савецкіх органаў было 125 жанчын – 14,7%. Іх колькасць сярод намеснікаў старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў паменшылася з 21,9% у 1989 г. да 18,4% у 1990 г. Толькі па аднаму райвыканкаму або гарвыканкаму ўзначальвалі жанчыны ў кожнай вобласці БССР (у Мінскай – 2).

За 1984–1985 гг. на 5% павялічылася колькасць работнікаў ва ўзросце да 40 год (40,3%). Сярэдні ўзрост намеснікаў старшынь аблвыканкамаў склаў – 51,3 года, старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў – 43,9 года, іх намеснікаў – 42,3 гады. Да 13.07.1987 г. яшчэ на 12,4% павялічылася колькасць старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў ва ўзросце да 40 год і складала 51,7%, старэйшых за 50 год – 7,2%. Сярэдні ўзрост старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў – 41,9% (1986 год – 43,2%), у Брэсцкай вобласці – 43,8%, Гродзенскай – 45,4%. Сярэдні ўзрост тых, хто стаў старшынёй гарадскіх і раённых выканкамаў быў 38 год, тых, хто пакінуў пасады – 41,4 год. У 1989 г. старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў ва ўзросце да 40 год стала 47,8%, у 1990 г. – 38%, намеснікаў гарадскіх і раённых выканкамаў адпаведна 50,3% і 46,9%. Кожны адзінаццаты старшыня і кожны сёмы намеснік старшыні гарадскіх і раённых выканкамаў быў старэйшы за 50 год. Па нацыянальнасці: беларусаў – 81,7%, рускіх – 11,5%, украінцаў – 2,9%, палякаў – 3,6%.

За 1984–1985 год з 22,5% да 16,9% паменшылася змяняльнасць сярод старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў. Больш паловы былі вылучаны на больш адказную працу. Намеснікаў старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў змянілася 16,5% (14,1% годам раней), з іх на больш адказную працу вылучылі – 25%. У той жа час 6 з іх (5,7%) былі вызвалены, як не справіўшыяся з даручанай працай або скампраметавалі сябе. У 1986–1987 гг. змяніўся кожны трэці старшыня гарадскіх і раённых выканкамаў і амаль кожны чацвёрты іх намеснік. Больш паловы змяніўшыхся старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў і 28,3% іх намеснікаў былі вылучаны на больш адказную працу. Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама, намеснікі старшынь Іванаўскага, Буда-Кашалёўскага і Гомельскага райвыканкамаў былі вызвалены ад займаемых пасад, як не справіўшыяся з даручанай працай [1, арк. 1–3; 2, арк. 61–62].

На 1.07.1990 г. у сувязі з правядзеннем справаздачна-выбарнай кампаніі павялічылась змяняльнасць савецкіх кадраў і склала 21,5% (1988 г. – 10,4%, 1989 г. – 17,3%). Змяніўся амаль кожны пяты намеснік старшынь аблвыканкама, кожны чацвёрты старшыня гарадскіх і раённых выканкамаў. На больш адказную працу былі вылучаны 57,8% старшынь і 28,8% намеснікаў старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў. За злоўжыванне службовым становішчам пазбавілі займаемай пасады намесніка старшымі Добрушскага райвыканкама. 19 старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў (10,6%) выбіраліся з некалькіх кандыдатур. Раней працаваўшыя старшынямі Буда-Кашалёўскага, Добрушскага, Ашмянскага, Бабруйскага і Чэрыкаўскага райвыканкамаў не былі выбраны на гэтыя пасады пры правядзенні альтэрнатыўных выбараў.

Аналіз склада старшынь абласных, гарадскіх і раённых саветаў паказаў, што ў ліпені 1990 г. 80% з ніх сумяшчалі сваю дзейнасць з асноўнай працай. 119 саветаў (64%) узначальвалі першыя сакратары абкамаў, гаркамаў або райкамаў КПБ, 8 (4,3%) – іншыя партыйныя работнікі, 21 (11,3%) – гаспадарчыя працаўнікі. У 38 саветах існавалі вызваленыя пасады старшынь саветаў, у тым ліку 13 у Мінскай вобласці, па 8 у Гомельскай і Гродзенскай, 5 у Магілёўскай, па 2 у Брэсцкай і Віцебскай абласцях. Амаль кожны трэці з старшынь саветаў выбіраўся на альтэрнатыўнай аснове.

У апошнія дзесяцігоддзі існавання БССР нацыянальнасць улічвалася ў анкетах і пры назначэнні на пасаду, але большасць грамадзян не надавала ёй вялікага значэння, усведамляючы сябе савецкімі людзьмі. З сярэдзіны 1970-х гг. на ўзроўні непасрэднай працы выканаўчых органаў улады з жыхарамі вага нацменшасцей практычна адпавядала нацыянальнаму складу насельніцтва БССР. У 1984–1985 гг. прадстаўніоў іншых нацыянальнасцей сярод кіраўнікоў прамысловых прадпрыеcтваў было: рускіх – 67 (32,7%), украінцаў – 24 (11,7 %), палякаў – 3 (1,5 %), яўрэяў – 3 (1,5 %), па 1 (0,5%) – армянін, немец, мардвін.

За перыяд з ліпеня 1984 па ліпень 1985 г. на 1,9% павялічылася змяняльнасць сярод 205 генеральных дырэктароў, дырэктароў прамысловых прадпрыемстваў і аб'яднанняў (гл. табл.). З ліку змяніўшыхся кіраўнікоў прадпрыемстваў 6 асоб (30%) былі вылучаны на больш адказную працу, 7 асоб (35%) вызвалены ў сувязі з выхадам на пенсію або па стану здароўя і адзін вызвалены як не справіўшыйся с працаю. Сярод гэтай катэгорыі кіраўнікоў працавалі толькі 2 жанчыны – генеральнымі дырэктарамі вытворчых аб'яднанняў малочнай прамысловасці БССР. Праз год сярод 229 кіраўнікоў прамысловасці і будаўніцтва было 4 кандыдаты і 1 доктар навук. 14 мелі ўзрост старэйшы за 60 год. За перыяд да ліпеня 1987 г. змяняльнасць павялічылася на 7,1% і складала – 17,9%. 6 асоб (14,6%) былі вылучаны на больш адказную працу, 34 (15,1%) былі вызвалены ў сувязі з пераходам на пенсію, па стану здароўя і па іншых прычынах, а дырэктар Гомельскага дзяржаўнага падшыпнікавага завода № 12 быў вызвалены, як не справіўшыйся з працай.

Найбольшая змяняльнасць у 1986–1987 гг. была сярод генеральных дырэктароў і дырэктароў прадпрыемстваў машынабудавання для лёгкай і харчовай прамысловасці і бытавога абсталявання, упраўляючых трэстамі, генеральных дырэктараў і дырэктараў прадпрыемстваў станкабудаўнічай і інструментальнай прамысловасці і складала адпаведна 37,5%, 20,9%, 17,2%. У якасным складзе начальнікаў упраўленняў буравых работ, дырэктараў прадпрыемстваў хімічнага і нафтавага машынабудавання, упраўляючых раённымі ўпраўленнямі энергетыкі і электрафікацыі, дырэктароў прадпрыемстваў цэлюлозна-папяровай прамысловасці істотных змен не адбылося, сярод іх змяняльнасці кадраў не было.

Для павышэнне якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу выкарыстоўваліся наступныя формы і метады: 1) абмеркаванне на сесіях саветаў і пасяджэннях іх выканкамаў, на сходах працоўных калектываў справаздач савецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў аб выкананні імі службовых і грамадскіх абавязкаў; 2) арганізацыя і правядзенне атэстацыі кіраўнікоў і спецыялістаў у міністэрствах, ведамствах БССР і іх падраздзяленняў; 3) стажыроўкі ў першы год кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў прадпрыемстваў прамысловасці; 4) павышэнне кваліфікацыі.

У выніку, неабходна адзначыць, што фарміраванне кадравага патэнцыялу БССР цалкам залежыла ад палітыкі кіруючых органаў СССР. Склад кіруючых работнікаў і спецыялістаў фарміраваўся не толькі ў залежнасці ад поглядаў і кампетэнтнасці асобы, але і адміністратыўным шляхам. Спробы ў 1970–1980-я гг. выправіць становішча ў эканоміцы шляхам змяняльнасці кадраў і ўкаранення розных метадаў павышэння якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу ва ўмовах існавання савецкай эканамічнай сістэмы, не прынесла чакаемага выніку. На адказных пасадах як у сферы дзяржаўнага кіравання, так і ў прамысловасці было мала жанчын, адчувалася праблема сталага ўзросту кіраўнікоў. Выразна прасочвалася нізкая змяняльнасць кіруючых кадраў, ды і то ў асноўным па гарызанталі, што істотна перашкаджала абнаўленню кадравага патэнцыялу і развіццю эканомікі БССР.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ЛІТАРАТУРА
1. Пояснительная записка отдела организационно-партийной работы ЦК КПБ. 20.07.1987 г. // НАРБ. – Фонд 4 п. Воп. 156. Спр. 406.
2. Пояснительная записка сектора учёта и переподготовки кадров отдела организационно-партийной работы ЦК КПБ. 12.07.1985 г. // НАРБ. – Фонд 4 п. Воп. 156. Спр. 982.
3. Справки о составе и сменяемости руководителей промышленных предприятий и объединений БССР за 1984–1987 гг. // НАРБ. – Фонд 4 п. Воп. 156. Спр. 982. Арк. 1–2 (1984–1985); Спр. 406. Арк. 4–5 (1986–1987).

**Склад і змяняльнасць кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў і яб'яднанняў БССР (на 1 ліпеня адпаведнага года) [3]**

| | 1984 | | 1985 | | 1986 | | 1987 | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % |
| Усяго пасад,<br>замешчаны работнікамі | 204<br>203 | 99,5 | 205<br>205 | 100 | 168<br>167 | 99,4 | 229<br>225 | 98,3 |
| у тым ліку жанчын | 1 | 0,5 | 2 | 1,0 | 1 | 0,6 | 1 | 0,4 |
| Узрост работнікаў | | | | | | | | |
| ад 31 да 35 | 4 | 2,0 | 4 | 2,0 | 2 | 1,2 | 5 | 2,2 |
| ад 36 да 40 | 11 | 5,4 | 18 | 8,8 | 17 | 10,2 | 33 | 14,7 |
| ад 41 да 45 | 37 | 18,2 | 29 | 14,1 | 20 | 12,0 | 26 | 11,6 |
| ад 46 да 50 | 74 | 36,4 | 76 | 37,1 | 47 | 28,1 | 59 | 26,2 |
| ад 51 да 55 | 42 | 20,7 | 42 | 20,5 | 42 | 25,1 | 59 | 26,2 |
| ад 56 да 60 | 29 | 14,3 | 29 | 14,1 | 27 | 16,2 | 29 | 12,9 |
| старэйшыя за 60 год | 6 | 3,0 | 7 | 3,4 | 12 | 7,2 | 14 | 6,2 |
| Адукацыя: вышэйшая | 202 | 99,5 | 205 | 100 | 167 | 100 | 224 | 99,6 |
| Мелі партыйную адукацыю | 3 | 1,5 | 5 | 2,4 | 4 | 2,4 | 4 | 1,8 |
| Беларусы | 98 | 48,2 | 105 | 51,2 | 91 | 54,5 | 127 | 56,4 |
| Члены КПСС | 203 | 100 | 205 | 100 | 167 | 100 | 225 | 100 |
| Стаж працы на займаемай пасадзе | | | | | | | | |
| да 1 года | 17 | 8,4 | 23 | 11,2 | 28 | 16,8 | 48 | 21,3 |
| ад 1 да 3 | 42 | 20,7 | 33 | 16,1 | 28 | 16,8 | 46 | 20,4 |
| ад 3 да 5 | 34 | 16,7 | 37 | 18,1 | 20 | 12,0 | 22 | 9,8 |
| ад 5 да 10 | 59 | 29,1 | 65 | 31,7 | 50 | 29,9 | 57 | 25,3 |
| больш за 10 год | 51 | 25,1 | 47 | 22,9 | 41 | 24,5 | 52 | 23,1 |
| Змянілася кіраўнікоў | 16 | 7,9 | 20 | 9,8 | 18 | 10,8 | 41 | 17,9 |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова